# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 9 снежня 1999 года, чацвер, № 19 (1811)

## Віншуем!



Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 снежня 1999 года № 705 за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых кадраў дэкану філалагічнага факультэта БДУ *Ларысе Аляксандраўне* ***МУРЫНАЙ*** прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навук Рэспублікі Беларусь».

Рэктарат, супрацоўнікі і студэнты Белдзяржуніверсітэта віншуюць Ларысу Аляксандраўну з такой высокай ацэнкай яе працы, жадаюць моцнага здароўя, творчых поспехаў, бадзёрасці і аптымізму, заставацца і надалей добрым прыкладам для калег і студэнтаў.

**КАНФЕРЭНЦЫІ**

# НОВЫ АТЛАС БЕЛАРУСІ



Выступленне рэктара А.У. Казуліна на пленарным пасяджэнні

З 22 па 24 лістапада гэтага года ў Беларускім дзяржаўным універсітэце праходзіла міжнародная навуковая канферэнцыя пад агульнай назвай "Праблемы комплекснага картаграфавання і стварэння міжрэгіянальных ГІС краін СНД". У ёй узялі ўдзел каля 100 спецыялістаў у галіне картаграфіі і геаінфармацыйных сістэм. Акрамя БДУ, арганізатарам канферэнцыі выступіў таксама Дзяржаўны камітэт па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі Рэспублікі Беларусь, які зараз займаецца падрыхтоўкай абноўленага выдання збору карт нашай краіны. Такім чынам, лістападаўская канферэнцыя з'явілася адным з рабочых этапаў распрацоўкі канцэпцыі і структуры Нацыянальнага атласа Беларусі, які плануецца выдаць у 2002 годзе. Дарэчы, падобны атлас выдаваўся толькі ў 1958 годзе.



У зале пасяджэнняў

Старшыня аргкамітэту навуковай канферэнцыі, рэктар БДУ А.У. Казулін у сваім дакладзе падкрэсліў, што Нацыянальны атлас Беларусі павінен уяўляць сабой комплексны картаграфічны твор, што раскрывае асаблівасці прыродна-рэсурснага патэнцыялу, насельніцтва, гаспадаркі, гісторыі і культуры, абагульняе асноўныя этапы і тэндэнцыі развіцця беларускай нацыі.



Падчас абмеркавання на выставе атласаў

Акрамя гэтай тэмы, што тычылася большай часткай беларускіх картографаў, на канферэнцыі абмяркоўваліся тэарэтычныя і метадычныя асновы комплекснага тэматычнага картаграфавання, былі разгледжаны пытанні стварэння геаінфармацыйных сістэм (ГІС) на аснове выкарыстання базавых лічбавых картаграфічных матэрыялаў і праблемы стварэння і мадэрнізацыі дзяржаўных геадэзічных сетак.

У канферэнцыі прымалі ўдзел таксама студэнты геаграфічнага факультэта БДУ. Спецыяльна да гэтай падзеі быў выдадзены зборнік, у якім прадстаўлены даклады ўдзельнікаў канферэнцыі. У чытальнай зале геафака была наладжана выстава геаграфічных атласаў.

Па выніках абмеркавання навуковых дакладаў удзельнікамі канферэнцыі была прынята рэзалюцыя, у якой акрэслены канкрэтныя крокі па падрыхтоўцы да выдання Нацыянальнага атласа Беларусі і перспектывы развіцця картаграфавання і ГІС.

*Юлія ШЧАРБАКОВА*

*P.S. Рэдакцыя газеты "Беларускі універсітэт" выказвае ўдзячнасць М.М. Брылеўскаму, намесніку дэкана геаграфічнага факультэта па навуковай працы, за прадстаўленую інфармацыю.*

*Фотаздымкі Генадзя* КРАСКОЎСКАГА

# Дапамога з Германіі

На медыцынскую кафедру Беларускага дзяржаўнага універсітэта прыйшла гуманітарная дапамога ад нямецкага дабрачыннага фонду "Дапамогі пацярпелым дзецям": 50 чалавек падабралі сабе акуляры.

Штаб-кватэра фонду размяшчаецца ў горадзе Хатцінген, які знаходзіцца на адлегласці каля 20 кіламетраў ад Эссена. Прэзідэнт фонду, доктар Ханс-Вернер Мёрс, займаецца дабрачыннай справай не першы год. Па словах Валянціны Леанідаўны Ганчаровай, прадстаўніцы гэтага фонду на Беларусі, калісьці доктар Ханс-Вернер Мёрс быў дырэктарам прадпрыемства, якое выраблялa дакладнае абсталяванне. Прыйшоў час, калі спадар Мёрс зразумеў, што ён ужо зарабіў столькі грошай, колькі яму патрэбна. Ён прадаў акцыі прадпрыемства і пачаў займацца дабрачыннасцю: дасылаў гуманітарную дапамогу ў дзіцячыя садкі для дзяцей з захворваннямі вачэй. Вялікую дапамогу атрымалі дзіцячае аддзяленне уралогіі чацвёртай клінічнай бальніцы і другая дзіцячая бальніца. А аднойчы ў сябе на радзіме ён убачыў дзяцей, якія вельмі адрозніваліся ад іншых. Аказалася, што гэта дзеці з Беларусі, якія прыехалі на адпачынак. Спадар Мёрс накіраваўся да сваіх даволі заможных сяброў і разам з імі пасылаў на Беларусь пасылкі з падарункамі. Трапіўшы на Беларусь, Ханс-Вернер быў здзіўлены нашым узроўнем жыцця, тым мноствам чалавечых і медыцынскіх праблем. А калі пабываў у вёсках, то жыццё ў гарадах паказалася казкай. Так, пры дапамозе спадара Мёрса было прывезена шмат абсталявання для бальніцы ў Стаўбцах, пабудавана новая паліклініка. Няхай абсталяванне было не новым, але ў даволі добрым стане. Дзякуючы гэтаму, стаўбцоўскія ўрачы маюць магчымасць самі ставіць дакладныя дыягназы. Для дзяцей да 14 гадоў па рэцэптах бясплатна робяць акуляры. Па-ранейшаму прыходзяць на Беларусь і калядныя, і велікодныя падарункі. У кожнай пасылцы, акрамя цукерак і іншых прысмакаў, абавязкова знаходзяцца зубная шчотка і паста.

Ужо два гады рэалізуецца праект, па якім у Беларусь прыходзяць акуляры. Зноў жа, яны не зусім новыя, але ў добрым стане. Распаўсюджванне ідзе па-рознаму. Супрацоўнікі фонду самі развозяць іх па вёсках. Напрыклад, у вёскі Ляды і Палянка Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці.



Падчас размеркавання акуляраў у БДУ

Прыемна бачыць, як гэта акцыя ўзрадавала бабулек і дзядкоў, якім вельмі патрэбны акуляры, а да горада самі дабрацца яны не ў стане. Акрамя таго, акуляры прапаноўваюць бальніцам, клінікам, прадпрыемствам, навучальным установам.

Так акуляры трапілі і на медыцынскую кафедру Белдзяржуніверсітэта. Распаўсюджваннем займаліся прафкамы супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ.

*Вольга КУЛІКОВА*

*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*



**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

Вядучага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі спектраскапіі паўправаднікоў — 1;

Старшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі спектраскапіі паўправаднікоў — 1.

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407, тэл. 226-47-64.

**РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады**

дацэнта кафедры эканамічных навук.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Кантактны тэлефон 222-83-03.



# Ярмарка вакансій для моладзі

29 лістапада ў Белдзяржуніверсітэце была наладжана ярмарка вакансій. Яе арганізавалі Мінскі гарадскі цэнтр занятасці моладзі гарадскога камітэта БПСМ, Мінскі гарадскі цэнтр занятасці насельніцтва і Белдзяржуніверсітэт. У мерапрыемстве прынялі ўдзел каля 3 тысяч маладых людзей з горада Мінска.

25 арганізацый, прадпрыемстваў і фірм сталіцы распавядалі пра сваю дзейнасць і прапаноўвалі моладзі вакантныя месцы. Акрамя таго, на ярмарцы працавалі юрыст, сацыёлаг, прафесійныя кансультанты цэнтра занятасці насельніцтва. Былі запрошаны спецыялісты цэнтраў занятасці насельніцтва з розных раёнаў Мінска. Можна было пазнаёміцца з камп'ютэрнай базай вакансій, якія ёсць у горадзе. Мэта гэтай акцыі — рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў галіне занятасці, прафілактыка беспрацоўя, падрыхтоўка маладых людзей да самастойнага выхаду на рынак працы.

Такія ярмаркі праводзяцца Мінскім гарадскім цэнтрам занятасці моладзі пачынаючы з 1997 года. Гэтая была чацвёртая. Сапраўды, моладзь гатовая да працы і жадае працаваць. У далейшым плануецца прыцягнуць да такіх акцый больш арганізацый, фірм, прадпрыемстваў, зацікаўленых у маладых спецыялістах.

*Аляксандр ЛАБКОЎ*



Знаёмства з камп'ютэрнай базай вакансій

*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

СЕМІНАРЫ

# НОВЫ ФАКУЛЬТЭТ ПРЭТЭНДУЕ НА РОЛЮ ЛІДЭРА Ў НОВЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ БІЗНЕСУ

*24 лістапада ў рамках 8-га міжнароднага салона "Сучасны офіс і банк" адбыўся семінар "Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі бізнесу і банкаўскай справы".*

Асноўная частка семінара была прысвечана праблемам Інтэрнэт-тэхналогій у сучасным бізнесе. Вынікі работы ў гэтай галіне прадставіла група студэнтаў і аспірантаў эканамічнага факультэта нашага універсітэта, якую ўзначаліў дэкан факультэта прафесар М.М. Кавалёў.

Прэзентацыю праведзеных работ пачаў сам дэкан, які Пастараўся найбольш поўна і лаканічна выказаць ролю Інтэрнэт-тэхналогій у глабалізацыі эканомікі. Увага таксама была сканцэнтравана на адной з самых перспектыўных сфер вядзення бізнесу — электроннага гандлю. Прафесар М.М. Кавалёў паказаў механізм заключэння падобных здзелак і падкрэсліў важнасць развіцця гэтых тэхналогій для пашырэння экспарту Рэспублікі Беларусь.

Інфармацыю аб электронным дакументаабароце ў знешнеэканамічнай дзейнасці прадставіў аспірант эканамічнага факультэта А.С. Геманаў. У сваім дакладзе ён выкарыстоўваў інфармацыю, атрыманую на сустрэчы ў Чэхіі, якая была прысвечана дадзенай тэме. Вынікі работ, заснаваных на дзвюх самых распаўсюджаных у свеце сістэмах электроннага дакументаабароту EDIFACT і яе амерыканскага аналага, сталі даступнымі прысутным на семінары. На базе схем еўрапейскай арганізацыі па праблемах электроннага дакументаабароту CEFACT А.С. Геманаў падрабязна растлумачыў перавагі гэтага віду дакументаабароту пры яго рэалізацыі на практыцы. Адзін з прыкладаў — змены ў працы мытняў, якія значна спрасцілі працэс уліку тавараў і паслуг. Вывадам стаў тэзіс аб непазбежнасці трансфармацыі дакументаабароту ў электронную форму ў працэсе глабалізацыі. Таксама непазбежна і прымяненне гэтых тэхналогій у бізнесе для эфектыўнага вядзення спраў.

Астатнія дакладчыкі эканамічнага факультэта расказалі аб праекце "Міждзяржаўны цэнтр электроннага гандлю", які ажыццяўляецца Белдзяржуніверсітэтам па асабістым даручэнні Прэзідэнта Беларусі. Першым паведамленнем аб сайт-партале стаў даклад А.С. Сярова, малодшага навуковага супрацоўніка эканамічнага факультэта.

Сайт-партал прадастаўляе бізнесу эфектыўны доступ да маркетынгавай і прававой інфармацыі, неабходны начальнікам аддзелаў збыту і іншым асобам, якія займаюцца прасоўваннем прадукцыі. Сайт-партал — не толькі спрошчаны шлях выкарыстання рэсурсаў глабальнай сеткі, але і спосаб адаптацыі айчынных вытворцаў да новых умоў вядзення бізнесу.

Сайт мае складаную структуру:
— непасрэдна партал;
— электронная дошка аб'яў;
— электронны магазін.

Партал уяўляе сабой сукупнасць мноства раздзелаў, якія ўтрымліваюць найбольш важныя і карысныя спасылкі на рэсурсы Інтэрнэт альбо на ўнутраныя рэсурсы "Міждзяржаўнага цэнтра электроннага гандлю" з далейшым выхадам у глабальную сетку. Сярод раздзелаў можна вылучыць:
— міжнародныя эканамічныя арганізацыі;
— фінансавыя арганізацыі і банкі;
— інфармацыя пра гандаль;
— прававое забеспячэнне бізнесу;
— аналітыка і статыстыка па рынках;
— паслугі (фінансавыя, турыстычныя, адукацыйныя);
— СМІ у галіне бізнесу.

Сайт-партал утрымлівае не толькі спасылкі на знешнія рэсурсы, але і на ўнутраныя рэсурсы "Міждзяржаўнага цэнтра электроннага гандлю" на рускай мове. Гэта інфармацыя рыхтуецца і змяшчаецца на сайце калектывам эканамічнага факультэта БДУ. Яна з'яўляецца найбольш каштоўнай інфармацыяй пра тыя ці іншыя арганізацыі і паслугі, якія яны прапануюць. Сайт-партал запоўнены таксама унікальнай прававой і рознай іншай інфармацыяй, пераклады на рускую мову якой даступны толькі на ім. У працэсе даклада пры дапамозе праектара наглядна дэманстравалася праца з сайтам.

Студэнт М.У. Раманчык сканцэнтраваў увагу слухачоў на электроннай дошцы аб'яў сайт-партала. Гэтая дошка ўяўляе сабой інфармацыю пра попыт і прапанову на даную прадукцыю. Уся гэтая інфармацыя падзелена па раздзелах у адпаведнасці з ГНЗЭД, што, па меркаванні распрацоўшчыкаў, робіць яе выключна зручнай для выкарыстання прадпрыемствамі краін СНД. Прадстаўнік любой фірмы альбо любая іншая асоба можа змясціць на гэтай дошцы інфармацыю аб наяўнасці той альбо іншай прадукцыі ці аб жаданні яе набыць, а таксама кантактную інфармацыю. Дакладчык спыніўся і на тэхналогіі, што выкарыстоўвалася для распрацоўкі дошкі аб'яў, растлумачыў яе перавагі. Дэманстравалася таксама выкарыстанне электроннай дошкі аб'яў.

Студэнт М.А. Фралоў прадэманстраваў працу электроннага магазіна "Міждзяржаўнага цэнтра электроннага гандлю", а таксама выклаў праблему электронных грошай і яе асаблівасці для сітуацыі ў Беларусі. Падкрэслівалася перспектыўнасць развіцця электронных магазінаў як элемента эфектыўнага вядзення спраў. Было таксама адзначана, што для больш поўнай рэалізацыі гэтага напрамку ў рэспубліцы неабходна ўдасканаленне сістэмы аплат і развіццё адпаведных тэхналогій.

Маркетолагі эканамічнага факультэта распрацавалі тыпавы праект сайта беларускага прадпрыемства. Непасрэдны ўдзел у гэтым прымаў студэнт 2-га курса А.В. Салохін, які і расказаў пра гэта. Актуальнасць распрацоўкі тыпавога праекта падкрэсліваецца тым, што асноўнай праблемай для прадпрыемстваў рэспублікі з'яўляецца праблема збыту. Як прыклад рэалізацыі праекта быў прадэманстраваны сайт прадпрыемства "Інтэграл", распрацаваны Студэнцкай лабараторыяй.

Напрыканцы прэзентацыі прагучала выступленне аспіранткі эканамічнага факультэта Т.У. Свірыд пра рэсурсы Інтэрнэт у галіне фінансавай і банкаўскай справы. Ён базіраваўся на аднайменным раздзеле сайта "Міждзяржаўнага цэнтра электроннага гандлю".

Заключная прамова прафесара М.М. Кавалёва падкрэсліла актуальнасць распрацовак у галіне Інтэрнэт-тэхналогій для сучаснага бізнесу. Развіццё гэтых тэхналогій было адзначана ім як адзін з важнейшых фактараў павелічэння беларускага экспарту і далейшай інтэграцыі Беларусі ў сусветную супольнасць.

*Дзмітрый КАЛІШУК,*
*студэнт 2-га курса*
*эканамічнага факультэта БДУ*

КОНКУРСЫ

# *Для падтрымкі навуковай дзейнасці*

Для падтрымкі і стымулявання навукова-даследчых прац студэнтаў і аспірантаў у Белдзяржуніверсітэце выкарыстоўваецца сістэма грантаў, якія выдзяляюцца на конкурснай аснове калектывам, якія складаюцца са студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, а таксама асобным студэнтам.

З 6 снежня 1999 года па 10 студзеня 2000 года Упраўленнем падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі вядзецца прыём дакументаў на конкурс грантаў 2000 года. Афармленне дакументаў на конкурс трэба праводзіць адпаведна з Палажэннем аб конкурсе грантаў, зацверджаным ў 1999 годзе, з якім можна пазнаёміцца ва Упраўленні падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі (вул. Бабруйская, 9, кабінет 417), а таксама ў адказных за навукова-даследчыя працы студэнтаў на факультэтах.

*К.М. КАРОСЦІК, начальнік Упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі*

*А.Г. ЗАХАРАЎ, начальнік аддзела НДПС БДУ*

*У адным з апошніх нумароў "Беларускага універсітэта" мы пачалі друкаваць артыкулы з серыі "Інтэрнэт для студэнтаў", падрыхтаваныя па просьбе рэдакцыі кафедрай эканамічнай інфарматыкі эканамічнага факультэта БДУ. Чытачы газеты ўжо пазнаёміліся з матэрыялам "Рэсурсы Інтэрнэт для эканамістаў". У гэтым нумары мы прапануем вашай увазе артыкул аб агульных адукацыйных сайтах Інтэрнэт.*

# РЭСУРСЫ ІНТЭРНЭТ

У апошні час у развітых краінах Інтэрнэт стаў неад'емнай часткай навучання, таму ўсё больш актуальным становіцца хуткі пошук у сетцы неабходнай адукацыйнай інфармацыі.

У гэтым артыкуле прадстаўлены рэсурсы Інтэрнэт у галіне адукацыі з кароткай анатацыяй, якая дае ўяўленне аб тым, што можна знайсці на сайце. Усе рэсурсы раздзелены на некалькі груп. Першая ўключае ў сябе спасылкі на найбольш агульныя адукацыйныя рэсурсы.

У другую групу сабраны сайты, на якіх можна знайсці інфармацыю аб сістэмах адукацыі, асаблівасцях адукацыйнага працэсу і вучобы ў розных краінах свету.

Трэцюю групу рэсурсаў прадстаўляюць электронныя адрасы адукацыйных устаноў краін свету.

Першая група агульнаадукацыйных рэсурсаў прадстаўлена ў асноўным міжнароднымі рэсурсамі, якія, як правіла, класіфікаваны па прадмеце, геаграфічнай прыкмеце ці якой-небудзь іншай.

**Сусветная інфармацыйная сетка па пытаннях адукацыі (GINIE)** – http://www.pitt.edu/~ginie пры Пітсбургскім універсітэце (ЗША) створана для інфармацыйнага забеспячэння і падтрымкі адукацыі ў пераходных краінах, а таксама для забеспячэння доступа да інфармацыі для людзей, якія працуюць у сферы адукацыі. GINIE прадастаўляе спасылкі на адукацыйныя сайты, пошук у базе даных і інш.

**Education World** – http://www. education-world.com/ прадастаўляе рэсурсы ў галіне пачатковай і сярэдняй адукацыі, утрымлівае мноства спасылак на агульнаадукацыйныя сайты.

На сайце **Education Index** – http://www.educationindex.com можна знайсці анатаваны каталог адукацыйных рэсурсаў і сайтаў, якія прадастаўляюць інфармацыю аб адукацыі. Адукацыйныя рэсурсы класіфікаваны па прадмеце (геалогія, гісторыя, музыка, сельская гаспадарка і г.д.) – http://www.educationindex.com/education-resources.html і стадыі адукацыі (школьная адукацыя, вышэйшая адукацыя і г.д.) – http://www.educationindex.com/lifestage.html.

**Інфармацыйны цэнтр рэсурсаў адукацыі (ERIC)** – http://www.accesseric.org/ – нацыянальная інфармацыйная сістэма ЗША, пры дапамозе 16 прадметных цэнтраў інфармацыі і іншых структур прадастаўляе мноства адукацыйных паслуг і прадуктаў.

**Інфармацыйны цэнтр рэсурсаў адукацыі AskERIC** – http://ericir.syr.edu/ прадастаўляе адукацыйную інфармацыю выкладчыкам, бібліятэкарам, адміністрацыйным работнікам і іншым зацікаўленым асобам па ўсяму свету. AskERIC уваходзіць у склад Інстытута інфармацыі – http://iis.syr.edu/ пры універсітэце ў Сырак'юс. AskERIC утрымлівае рэсурсы адукацыі ўсёй сістэмы ERIC.

У склад AskERIC уваходзяць:

– даведачная служба AskERIC – http://ericir.syr.edu/Qa/.

– віртуальная бібліятэка AskERIC – http://ericir.syr.edu/Virtual/index.html.

– пошук у базе даных ERIC – http://ericir.syr.edu/Eric/.

Яшчэ адзін Інтэрнэт-каталог у галіне адукацыі – **Каталог інфармацыі ў сферы сацыяльных навук** (Social Science Information Gateway – SOSIG) – http://sosig.esrc.bris.ac.uk/ прадастаўляе доступ да вялікай колькасці Інтэрнэт-рэсурсаў у сферы адукацыі і даследаванняў у галіне сацыяльных навук.

**WWW VL – сусветная віртуальная бібліятэка** адукацыйных сайтаў – http://www.csu.edu.au/edukation/all.html утрымлівае вялікую колькасць адукацыйных спасылак, на кожную з якіх даецца анатацыя.

**Рэсурсы адукацыі on-line** http://www.december.com/cmc/info/applications-education.html утрымлівае розныя спасылкі на адукацыйныя сайты.

**Рэсурсы адукацыі для студэнтаў і выкладчыкаў** – http://quest.arc.nasa.gov/OER/.

**Адукацыйныя рэсурсы Інтэрнэт** – http://www.thespa.com/guy.williams/main1.htm – падборка сайтаў, якія прадастаўляюць інфармацыю ў сферы адукацыі.

**Study Web** – http://www.studyweb.com/ – каталог, які змяшчае каля 17000 адукацыйных сайтаў для студэнтаў і выкладчыкаў.

**Спасылкі на адукацыйныя рэсурсы** прадстаўлены таксама універсітэтам Місуры – http://tiger.coe.missouri.edu/Resource.html.

Некаторыя агульнаадукацыйныя рэсурсы Расіі:

**ORT-Расія** – http://www.ort.ru – прадстаўніцтва буйнейшай міжнароднай адукацыйнай арганізацыі World ORT Union (Organization for Educational Resources & Technological Training).

На серверы прадстаўлена агульная інфармацыя аб гэтай арганізацыі і яе прадстаўніцтве ў Расіі, а таксама аб адукацыйных праектах, якія рэалізуюцца ў Расіі, і аб рэсурсах Internet, якія падтрымлівае ORT у розных краінах свету.

**Адукацыйныя інфармацыйныя прадукты** – http://www.redline.ru/orgsedu/infoprod/ – прадстаўлены звесткі аб базах даных, відэафільмах, камп'ютэрных навучаючых праграмах, даведачных выданнях і іншых інфармацыйных прадуктах для сферы адукацыі.

Інфармацыю аб сістэмах адукацыі розных краін, як правіла, прадастаўляюць міжнародныя арганізацыі.

Сярод найбольш вядомых неабходна адзначыць **ЮНЕСКА (UNESKO) – Арганізацыя ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры** – http://www.unesco.org. На сайце гэтай арганізацыі акрамя агульнай інфармацыі аб ЮНЕСКА знаходзіцца інфармацыя аб бягучых падзеях у сферы адукацыі, якія праводзіць ЮНЕСКА – канферэнцыі, круглыя сталы, саміты па пытаннях адукацыі, навукі і культуры; публікацыі; інфармацыя аб адукацыйных праграмах ЮНЕСКА; дакументы і статыстычныя матэрыялы ў галіне адукацыі; пералік інфармацыйных паслуг у галіне адукацыі, а таксама спасылкі на іншыя адукацыйныя сайты, якія знаходзяцца як пад эгідай ЮНЕСКА, так і іншых міжнародных арганізацый і іншых краін, базы даных і спасылкі на агульныя адукацыйныя рэсурсы.

Прадстаўніцтва ЮНЕСКА ў Расіі – http://www.unesco.ru – на серверы можна знайсці інфармацыю аб клубах ЮНЕСКА ў Расіі.

Пад эгідай ЮНЕСКА працуе **міжнароднае бюро па адукацыі (IBE)** – інфармацыйны і даследчы цэнтр ЮНЕСКА ў галіне адукацыі – http://www.ibe.unesco.org.

Міжнароднае бюро па адукацыі працуе ў трох напрамках: збор, апрацоўка і далейшая паглыбленая праца з адукацыйнай інфармацыяй і дакументацыяй; параўнальныя даследаванні ў галіне адукацыі; забеспячэнне палітычнага дыялогу міністраў адукацыі.

Акрамя таго, на сайце міжнароднага бюро па адукацыі можна знайсці спіс спасылак http://www.ibe.unesco.org/News/Link/links.htm на іншыя адукацыйныя сайты, сайты міжнародных арганізацый і навукова-даследчых інстытутаў у галіне адукацыі, міністэрстваў адукацыі розных краін свету.

Акрамя таго, на серверы ЮНЕСКА ёсць сайт **міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў** – http://www.unesco.org/iau/, на якім можна знайсці апісанне розных адукацыйных устаноў усіх краін свету, а таксама міжнародных адукацыйных устаноў і нацыянальных адукацыйных арганізацый. Ёсць на сайце і апісанне сістэм вышэйшай адукацыі розных краін свету – http://www.unesco.org/iau/wad.html:

- структура адукацыйнай сістэмы краіны (сярэдняя, вышэйшая адукацыя, інстытуцыйная структура вышэйшай адукацыі, вучоныя ступені, сістэма адзнак);
- праграмы фінансавай дапамогі студэнтам, асноўныя студэнцкія арганізацыі;
- правілы паступлення ў навучальныя ўстановы і прызнанне замежных дыпломаў;
- міжнароднае супрацоўніцтва і абмены.

Сярод іншых міжнародных арганізацый у сферы адукацыі неабходна адзначыць таксама **Асацыяцыю еўрапейскіх універсітэтаў (CRE)** – http://www.unige.ch/cre/.

У асацыяцыю ўваходзяць 527 еўрапейскіх універсітэтаў і асацыятыўных членаў еўрапейскіх краін. Мэта гэтай арганізацыі – садзейнічаць дыялогу і супрацоўніцтву паміж прадстаўнікамі розных еўрапейскіх універсітэтаў. CRE публікуе розную інфармацыю аб вышэйшых навучальных установах краін Еўропы, аб адукацыйных праграмах, канферэнцыях і семінарах.

**Еўрапейская інфармацыйная сетка ў сферы адукацыі (EURYDICE)** – http://www.eurydice.org/ прадастаўляе доступ у рэжыме on-line да баз даных па пытаннях адукацыі, утрымлівае параўнальныя характарыстыкі сістэм адукацыі краін – членаў ЕС.

**Ortelius** http://193.43.17.5/ortelius/index2.html – база даных па вышэйшай адукацыі ў краінах - членах ЕС, прадастаўляе апісанне сістэм вышэйшай адукацыі краін ЕС, таксама ўключае секцыю, якая ўтрымлівае апісанне сістэм вышэйшай аду

кацыі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

**Нямецкі інстытут міжнародных педагагічных даследаванняў** — http://www.dipf.de/ прадастаўляе вялікую колькасць параўнальнай інфармацыі аб адукацыі і розных нацыянальных адукацыйных сістэмах, а таксама базу даных аб адукацыі на нямецкай і англійскай мовах.

Інфармацыю аб адукацыі і адукацыйнай сістэме канкрэтнай краіны можна атрымаць непасрэдна з афіцыйных сайтаў міністэрстваў ці аддзелаў адукацыі краіны — http://gksoft.com/govt/en.

вых сістэм для пошуку адукацыйнай інфармацыі найбольш спецыялізаванай, мабыць, з'яўляецца **Yahoo**. Тут у раздзеле «Адукацыя» ёсць шмат спасылак, акрамя таго, існуе разбіўка адукацыйных рэсурсаў па рэгіянальнай і па прадметнай прыкмеце.

З расійскіх пошукавых сістэм можна адзначыць **Рамблер** — http://www.rambler.ru/, **Yandex** — http://www.yandex.ru/, **Апорт** — http://www.aport.ru/.

Трэцяя група рэсурсаў прадстаўлена адукацыйнымі ўстановамі краін свету. Найбольш поўны спіс універсітэтаў і каледжаў краін свету можна адшукаць на англійскай мове па

Маскоўскі дзяржаўны інстытут радыётэхнікі, электронікі і аўтаматыкі — http://www.mirea.ac.ru/

Маскоўскі дзяржаўны інжынерна-фізічны інстытут — http://www.mephi.ru/

Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін — http://www.mgimo.ru/

Маскоўскі дзяржаўны інстытут электронікі і матэматыкі — http://www. miem.edu.ru/

Маскоўскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт імя Н.Э. Баумана — http://www.bmstu.ru/

Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М.В. Ламаносава — http://www.msu.ru/

Маскоўскі дзяржаўны універсітэт эканомікі, статыстыкі і інфарматыкі — http://www.mesi.ru/

Маскоўскі энергетычны інстытут — http://www.mpei.ac.ru/

Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут — http://www.mipt.ru/

# У ГАЛІНЕ АДУКАЦЫІ

**Савет па міжнародных даследаваннях і абменах (IREX)** — http://www.irex.org прадастаўляе на сайце інфармацыю аб магчымасцях для студэнтаў, выкладчыкаў, вучоных атрымаць стыпендыі для правядзення навуковых даследаванняў у галіне гуманітарных і грамадскіх навук, удзельнічаць у праграмах міжнародных абменаў, іншых конкурсах. Прадстаўніцтва IREX у Расіі — http://www.irex.ru, у Рэспубліцы Беларусь — http://www.irex.minsk.by.

Інфармацыю аб адукацыі ў Расіі можна атрымаць на серверы **Цэнтра інфарматызацыі Міністэрства агульнай і прафесійнай адукацыі РФ** — http://www.informika.ru. На серверы знаходзіцца сайт Міністэрства адукацыі Расіі, базы даных, інфармацыя аб бягучых падзеях у сферы адукацыі і навіны, спасылкі на расійскія газеты і часопісы і інш.

**"Універсітэцкія сеткі ведаў" (УНІКОР)** — http://www.UNICOR.ru/. УНІКОР арганізавана з мэтай рэалізацыі нацыянальнай часткі міжнароднага праекта UNICOM, ініцыяванага Еўрапейскім цэнтрам ЮНЕСКА па вышэйшай адукацыі. На серверы ёсць сістэма пошуку па WWW-серверах удзельнікаў УНИКОР (імі цяпер з'яўляюцца каля 130 універсітэтаў і больш 50 інстытутаў Расійскай Акадэміі Навук) і шэрагу іншых навуковых і адукацыйных арганізацый, ёсць раздзел, прысвечаны Дзяржаўным адукацыйным стандартам.

**Федэральная універсітэцкая камп'ютэрная сетка Расіі RUNNet** — http://www.runnet.ru аб'ядноўвае рэгіянальныя сеткі і сеткі буйных навуковых і адукацыйных устаноў.

**РасНДІ інфармацыйных сістэм** — http://www/riis.ru — дзяржаўная навукова-даследчая ўстанова, якая вядзе шырокі спектр работ, звязаных з распрацоўкай і выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій у сферы адукацыі.

Асобнай групай можна вылучыць агульныя пошукавыя сістэмы, да якіх таксама можна звяртацца для пошуку той альбо іншай адукацыйнай інфармацыі.

Сярод англамоўных пошукавых сістэм можна назваць **Yahoo** — http://www.yahoo.com, раздзел «Адукацыя» — http://www.yahoo.com/education/, **AltaVista** — http://www.altavista.com, **HotBot** — http://www.hotbot.com, **InfoSeek** — http://www.infoseek.com, **Looksmart** — http://www.looksmart.com, **Lycos** — http://www.lycos.com, **Metacrawler** — http://www.metacrawler.com, **Dogpile** — http://www.dogpile.com і іншыя. З гэтых пошука-

адрасе http://www.mit.edu:8001/people/cdemello/univ.html.

Спасылкі на школы розных краін свету можна знайсці на сайце — http://www.worldwide.edu/.

Сайт http://www.higher-ed.org прысвечаны пытанням вышэйшай адукацыі, змяшчае інфармацыйныя рэсурсы ў сферы вышэйшай адукацыі розных краін свету.

Адрасы сайтаў нямецкіх універсітэтаў пабудаваны па наступнай простай схеме: http://www.uni- імя горада, у якім знаходзіцца універсітэт.de. Напрыклад, партнёр БДУ — Рурскі універсітэт ў Бохуме мае адрас: http://www.ruhr-uni-bochum.de, а Йенскі універсітэт: http://www.uni-jena.de.

Інфармацыю аб школах Расіі можна знайсці па адрасе: http://schools.techno.ru.

Поўную інфармацыю аб вышэйшых навучальных установах Расіі можна атрымаць на сайце Міністэрства адукацыі: http://www.informika.ru/windows/goscom/.

Вось адрасы найбольш вядомых расійскіх універсітэтаў.

Архангельскі дзяржаўны універсітэт — http://www.pomorsu.ru/

Алтайскі дзяржаўны універсітэт — http://www.dcn-asu.ru/

Уладзімірскі дзяржаўны універсітэт — http://www.vpti.vladimir.ru/

Валгаградскі дзяржаўны універсітэт — http://www.vstu.ru/

Варонежскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт — http://www.vorstu.ac.ru

Дальнеўсходні дзяржаўны універсітэт (Уладзівасток) — http://www.dvgu.ru/

Іркуцкі дзяржаўны універсітэт — http://www.isu.ru/

Казанскі дзяржаўны універсітэт — http://www.ksu.ru

Калінінградскі дзяржаўны універсітэт — http://www.albertina.ru/

Краснаярскі дзяржаўны універсітэт — http://www.krascience.rssi.ru/ksu/univru.html

Кубанскі інстытут міжнароднага прадпрымальніцтва і менеджменту — http://gwkib.kuban.ru

Курскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт — http://www.kstu.kursk.ru/

Акадэмія народнай гаспадаркі пры Урадзе Расійскай Федэрацыі (Масква) — http://www.ane.ru/

МАТИ — Расійскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт — http://www.mati1.ru/

Міжнародная акадэмія бізнесу і банкаўскай справы — http://www.iabb.edu.ru/

Маскоўская дзяржаўная юрыдычная акадэмія — http://msla.da.ru

Мурманскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт — http://www.mstu.edu.ru/

Ніжагародскі дзяржаўны універсітэт — http://www.unn.ac.ru/

Наўгародскі дзяржаўны універсітэт — http://www.novsu.ac.ru/

Навасібірскі дзяржаўны універсітэт — http://www.nsu.ru/

Омскі дзяржаўны універсітэт —http://www.omsu.omskreg.ru/

Пензенскі дзяржаўны універсітэт — http://www.stup.ac.ru/win/main.ru.html

Пермскі дзяржаўны універсітэт — http://www.psu.ru/

Расійская акадэмія дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце РФ (Масква) — http://www.rags.ru/

Расійская эканамічная акадэмія (Масква) — http://www.rea.ru/

Расійскі дзяржаўны гуманітарны універсітэт (Масква) — http://www.rsuh.ru/

Растоўская дзяржаўная эканамічная акадэмія — http://www.appleclub.donpac.ru/

Растоўскі дзяржаўны універсітэт — http://www.rnd.runnet.ru/

Самарскі дзяржаўны універсітэт — http://www.samara.emnet.ru/

Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт — http://www.unilib.neva.ru/

Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны універсітэт — http://www.spb.edu/

Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны універсітэт тэлекамунікацый — http://www.sut.ru/

Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны універсітэт эканомікі і фінансаў — http://www.uef.ru/

Саратаўскі дзяржаўны універсітэт — http://www.ssu.runnet.ru/win/ras.htm

Тамбоўскі дзяржаўны універсітэт — http://tsu.mtts-tambov.ru

Тваскі дзяржаўны універсітэт — http://university.tversu.ru/

Томскі дзяржаўны універсітэт — http://www.tsu.ru/

Ульянаўскі дзяржаўны універсітэт — http://sv.uven.ru

Уральскі дзяржаўны універсітэт — http://www.usu.ru/

Уральскі дзяржаўны эканамічны універсітэт — http://www.usue.ru/

Хабараўскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт — http://www.khstu.khabarovsk.su/

Чэлябінскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт — http://www.tu-chel.ac.ru

Яраслаўскі дзяржаўны універсітэт — http://www.yars.free.net/English/Science/YSU/un

*Святлана БАТРАКОВА, студэнтка 5-га курса эканамічнага факультэта БДУ*

# АРХІВЫ НА ШЛЯХУ Ў XXI СТАГОДДЗЕ

8-10 лютага 2000 года на гістарычным факультэце Белдзяржуніверсітэта з удзелам генеральных інспектараў Дырэкцыі архіваў Францыі **Жэрара Эрмісса, Элізабет Рабю**, а таксама кіраўніка міжнародных стажыровак, прафесара архівістыкі Парыжскага універсітэта (Сарбона) **Агнес Масон** адбудзецца Другі беларуска-французскі архіўны семінар "Архівы на шляху ў XXI стагоддзе. Спадчына. Гісторыя. Час".

Далі згоду на ўдзел у семінары спецыялісты з Германіі, ЗША, Канады, Польшчы, Фінляндыі, Латвіі, Расіі, Украіны і іншых краін.

У першы дзень семінара 8 лютага плануецца абмеркаваць наступныя тэмы: камунікацыя архіваў — пастаянства і эвалюцыя: архівы і даследчыкі; праблемы камунікацыі: права на інфармацыю, права на сакрэты; змяненне тэрмінаў камунікацыі; новыя пытанні; інфармацыя і інфармаванне грамадства; інфарматыка і яе ўздзеянне на сучасныя архівы; французскія інфармацыйныя сістэмы архіўнага кіравання.

9 лютага будуць уздымацца такія тэмы як архівы і іх культурныя функцыі: культурная актыўнасць у архівах, іх роля, выхаваўчая і адукацыйная функцыі; новыя архівы: характар, праблемы; у напрамку да Палаца памяці; архівы праз час; еўрапейскае супрацоўніцтва: навуковыя пошукі паміж Усходам і Захадам; архіўныя таварыствы ("Сябры архіваў" на пачатку свайго супрацоўніцтва). У праграме — курс лекцый па гісторыі і арганізацыі архіваў Францыі, прэзентацыя аматарскай газеты "Сябры архіваў".

У апошні дзень семінара, 10 лютага, будзе абмяркоўвацца сістэма універсітэцкай архіўнай адукацыі: параўнальныя сістэмы архіўнай адукацыі ў Францыі і Беларусі; Нацыянальная школа Хартый; сучасныя метады адукацыі; эвалюцыя Нацыянальных архіваў Францыі і Беларусі: адкрыты шлях; дэбаты аб нацыянальнай канцэпцыі развіцця архіваў Беларусі; станаўленне: цяжкасці і амбіцыі беларускіх архівістаў. Адбудзецца прэзентацыя беларуска-французскага слоўніка архіўнай тэрміналогіі, а таксама матэрыялаў Першага і Другога беларуска-французскіх семінараў.

У рамках семінара будуць працаваць наступныя секцыі:

беларуска-французская архівістыка: спадчына, гісторыя і памяць (кіраўнікі К.І. Козак, М.Ф. Шумейка з Беларусі, Жэрар Эрміс, Элізабет Рабю, Агнес Масон з Францыі);

антрапалогія і архівы: здабыткі, гісторыя і час (кіраўнікі В.М. Шутава з Беларусі, Дж. Атлас з ЗША, Юхані Іханус з Фінляндыі, С.Шпак з Расіі);

архіўная інфарматыка: стан і перспектывы (кіраўнікі У.Н. Сідарцоў з Беларусі, Е.І. Сафонава з Расіі, Пітэр Доорн з Нідэрландаў).

Акрамя таго, да семінара запланавана выданне матэрыялаў. Жадаючыя могуць дасылаць на адрас арганізатараў мерапрыемства свае паведамленні аб'ёмам 3-4 машынапісных, а даклады на 6-10 машынапісных лістоў, не пазней за 1 студзеня 2000 года (арганізатары пакідаюць за сабой права адбору тэкстаў).

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6, кафедра крыніцазнаўства і музеязнаўства БДУ. Тэл. 222-36-07, 226-01-75. Email: Zirol@hist.bsu.unibel.by

*К.І. КОЗАК, дацэнт кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства гістарычнага факультэта БДУ*



# БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ НАВУКОВЫЯ СУВЯЗІ

Працягваюць пашырацца сувязі паміж беларускімі і польскімі гісторыкамі. У цякучым годзе на гістарычным факультэце было арганізавана нямала мерапрыемстваў. Напрыклад, у міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Французская рэвалюцыя і лёсы свету" прымалі ўдзел прадстаўнікі Варшаўскага, Люблянскага і Шчэцінскага універсітэтаў. З улікам вялікай наяўнасці ў архівах Беларусі польскамоўных дакументаў пашырана вядзецца выкладанне польскай мовы на гісторыка-архіўным аддзяленні БДУ, без чаго немагчыма падрыхтоўка адукаваных нацыянальных спецыялістаў. На базе ж польскіх навуковых цэнтраў перыядычна рыхтуюць свае навуковыя даследаванні вядучыя беларускія гісторыкі. Такія магчымасці былі выкарыстаны загадчыкам кафедры гісторыі Беларусі старажытнага свету А.П. Лойка, дактарантам У.А. Сосна, дацэнтам У.П. Емельянчыкам і інш. На 16-ты міжнародны Касцюшкаўскі сімпозіум у Мецiёвiцах, які адбыўся ў кастрычніку, былі запрошаны дацэнты К.І. Козак і А.А. Гужалоўскі. Праведзеныя мерапрыемствы далі значныя вынікі.

Прывядзем толькі адзін. Аддаючы даніну павагі прадстаўніку народаў Беларусі, Польшчы, Францыі, ЗША, адзначаючы неабходнасць узнаўлення культурнай спадчыны на яго Радзіме, было вырашана ўз'яднаць намаганні бакоў у напрамку пашырэння навукова-асветніцкай дзейнасці. Для каардынацыі і лепшай арганізацыі такіх дзеянняў з ліку выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта, а таксама добраахвотнікаў з Францыі, ЗША, Польшчы, утворана група Беларускага Касцюшкаўскага цэнтра (кір. У.П. Емельянчык). Ім запланаваны падрыхтоўка і правядзенне на базе гістарычнага факультэта ў лістападзе 2000 года міжнароднага семінара "Беларусь і Тадэвуш Касцюшка: спадчына, час і здабыткі", невялікая выстава з найноўшых дакументаў Нацыянальных гістарычных архіваў у Мінску і Гродна, а таксама музея Касцюшкі ў Мецiёвiцах "Славутыя постаці Беларусі".

Патрэбна ўлічыць, што такая праца вядзецца сумеснымі намаганнямі выкладчыкаў і студэнтаў. Пра гэта сведчыць распачаты спецкурс з удзелам дырэктара Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў, доктара гісторыі і права Фернанда Бакура (Францыя), дзе ўзнята тэма "Тадэвуш Касцюшка ў свядомасці народаў: псіхалагічны і гістарычны партрэт". Разам з тым, ідзе падрыхтоўка адпаведных курсавых, складванне навуковай бібліяграфіі аб дзейнасці Тадэвуша Касцюшкі. Мяркуецца штогадовае перавыданне на беларускай мове найбольш значных кніжак польскіх, французскіх і іншых аўтараў.

Добрым працягам будуць запланаваныя са снежня 1999 года сустрэчы з прадстаўнікамі польскіх архіваў: дырэктарам архіва галоўнага ўпраўлення статыстыкі Польшчы Янам Бергерам, які прачытае невялікі курс лекцый "Традыцыі польскай статыстыкі", дырэктарам Любанскага архіва Адамам Банецкім аб арганізацыі і дзейнасці мясцовых польскіх архіваў, а таксама выкладчыкаў архіўных аддзяленняў Познанскага і Турунскага універітэтаў. Шэраг польскіх спецыялістаў мае намер удзельнічаць таксама ў Другім беларуска-французскім архіўным семінары ў лютым 2000 года. Відавочна, гэта стане магчымым дзякуючы намаганням не толькі гістарычнага факультэта, а таксама станоўчай падтрымцы з боку Дырэкцыі архіваў Польшчы, кіраўніка Польскага інстытута Томаша Негодзіша. Наперадзе ў Белдзяржуніверсітэта — больш значная і эфектыўная садружнасць гісторыкаў і гісторыкаў-архівістаў дзвюх краін.

*К.І. КОЗАК, дацэнт кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства гістарычнага факультэта БДУ*

НАША ЗДАРОЎЕ

# З прыгожай усмешкай

Студэнцкі стаматалагічны кабінет "Джонатан", які пачаў працаваць больш як год таму назад, заяўляе пра сябе на новым узроўні. Новае дадатковае абсталяванне фірмы SIMIENS дазваляе трымаць стаматалогію БДУ у адпаведнасці з патрабаваннямі хуткаплыннага часу. Час мінае — і бяспека пры лекаванні зубоў становіцца больш дасканалай. Бяспека стаматалагічнага абсталявання ад SIMIENS увабрала ў сябе сістэму дэзінфекцыі, сістэму "антыСНІД". Сістэма стэрылізацыі забяспечвае дыстыліраваную ваду ў стаканах і наканечніках.

Да навінак, якія з'явіліся ў "Джонатане", трэба дадаць сістэму "аэрафлоў", з дапамогай якой здымаюць налёт на зубах, робяць масаж дзясен. Раней для адбельвання зубоў выкарыстоўвалі ультрагук. Новая сістэма дазваляе праводзіць працэдуру значна часцей (2-3 разы ў месяц) і зрабіла яе больш таннай.

"Джонатан" працягвае ажыццяўленне сацыяльна арыентаванай праграмы, у межах якой прапануе сістэму скідак у адпаведнасці з аб'ёмам лекавання. Абноўлены "Джонатан" нагадвае студэнтам, уладальнікам пласцікавых картак "Oral health", пра іх ільготныя магчымасці і запрашае прыйсці на бясплатны агляд. Нагадваю, што валодаць такой прыгожанькай карткай, якая сведчыць пра скідкі пры лекаванні і бясплатнае атрыманне сродкаў гігіены поласці рота, могуць тыя студэнты, якія зрабілі з дапамогай "Джонатана" сваю ўсмешку бліскучай, залекаваўшы тут усе хворыя зубы. "Гэтая заахвочвальная праграма "Oral health", — тлумачыць дырэктар Леанід Засценчык, — увасабляе неабходнасць прывесці ў парадак зубы менавіта ў маладыя гады студэнцкага перыяду. У гэтым выпадку ёсць шанц захаваць здаровыя зубы да старасці. А паколькі ў арганізме ўсё ствapae цэласную ўзаемасувязь, зубныя праблемы могуць выклікаць іншыя недамаганні: запаленчыя працэсы зубоў могуць стаць прычынай нават нечаканага выпадзення валасоў, — я не кажу пра вострыя зубны боль. Тады ўжо не да вучобы".

*Алеся КРЫВІЦКАЯ, студэнтка 3-га курса факультэта журналістыкі*

СЛУЖБА 02

# ЗЛАЧЫНСТВА ЛЯГЧЭЙ ПАПЯРЭДЗІЦЬ

У апошні час сталі больш частымі выпадкі разбойных нападаў на кватэры, узрасла колькасць кватэрных крадзяжоў.

10 кастрычніка ў міліцыю звярнулася студэнтка 1-га курса БДПА з заявай аб тым, што ў яе прама на вуліцы двое невядомых скралі скураную куртку, грошы, сумку з прадуктамі і ўцёклі. Па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа і вядзецца расследаванне.

З падобнай заявай звярнулася грамадзянка С. Дзве невядомыя дзяўчыны пабілі яе непаўналетнюю дачку — студэнтку 1-га курса МАСТа і адабралі ў яе жаночыя бацінкі, пасля чаго зніклі. Праз паўгадзіны дзяжурным нарадам Маскоўскага РУУС па вуліцы Купрыянава разам са скрадзеным былі затрыманы 18-гадовыя С. і Э. За здзяйсненне гэтага злачынства ў адносінах да іх узбуджана крымінальная справа па ч.2. арт. 88 КК РБ, што прадугледжвае адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 3 да 7 гадоў.

Большая частка падобных злачынстваў — вынік зручнага выпадку. Міліцыя робіць захады па ўстанаўленню і прыцягненню да адказнасці злодзеяў і рабаўнікоў. Толькі своечасовыя меры бяспекі могуць папярэдзіць злачынства. А гэта значна лягчэй, чым знайсці асоб, якія здзейснілі яго.

Для таго, каб не стаць ахвярай злачынства, настойліва рэкамендуем выконваць наступныя меры бяспекі:

— увечары пазбягайце маршрутаў, якія пралягаюць праз двары і дрэнна асветленыя вуліцы;

— не бярыце спадарожніка ў сваю аўтамашыну ў выпадку, калі вы не ўпэўнены ў яго намерах і сваёй бяспецы;

— не затрымлівайцеся адзін да глыбокай ночы на вуліцы, калі ёсць магчымасць, трымайцеся ў кампаніі сяброў;

— старайцеся запомніць асаблівыя прыкметы злачынцы, пры дапамозе якіх міліцыя хутчэй зможа арганізаваць пошук;

— аб усіх фактах нападу, абрабавання адразу паведамляйце па тэлефоне 02, пры адсутнасці паблізу тэлефона выкарыстоўвайце перагаворнае ўстройства ў ліфце.

*Вікторыя МАЛЫШКА, супрацоўнік Маскоўскага РУУС*

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# Лекцыя на заказ

У лістападзе гэтага года ў інтэрнатах БДУ прайшлі сустрэчы студэнтаў першых курсаў з псіхолагамі сацыяльна-псіхалагічнага цэнтра студэнцкага гарадка БДУ. Мэта такіх сустрэч — праінфармаваць студэнтаў аб існаванні псіхалагічнага цэнтра, які працуе менавіта для студэнтаў, даць зразумець студэнтам, што іх праблемы дапамогуць вырашыць спецыялісты.

Сустрэчы былі арганізаваны такім чынам, што спачатку псіхолагі расказалі прысутным аб формах і метадах работы цэнтра, аб асноўных праблемах, з якімі сутыкаюцца студэнты падчас навучання, магчымых асабовых і міжасабовых праблемах. Студэнты даведаліся, што сацыяльна-псіхалагічны цэнтр займаецца рознымі відамі дзейнасці: псіхадыягнастычнай, развіваючай, асветніцкай і кансультаваннем. На падставе даследчай працы, якая праводзіцца цэнтрам, быў прадстаўлены аналіз праблемных момантаў, якія ўзнікаюць у студэнтаў у сувязі з фарміраваннем працэсу навучання і самападрыхтоўкі, самастойнага рэгулявання жыццядзейнасці ва ўмовах пражывання ў інтэрнаце, актыўнага ўзаемадзеяння з сацыяльным акружэннем (аднакурснікамі, выкладчыкамі, адміністрацыяй інтэрната і г.д.). У канцы псіхолагі адказалі на пытанні студэнтаў, расказалі аб рэжыме работы цэнтра, спецыялістаў, якія ўцягнуты ў працэс сацыяльна-псіхалагічнай дзейнасці студэнцкага гарадка, а таксама гарадскіх службаў.

Псіхадыягнастычнай дзейнасцю называюць правядзенне даследвання з дапамогай пэўных методык з наступным аналізам вынікаў. У цэнтры ёсць як бланкавыя, так і камп'ютэрныя варыянты методык псіхадыягностыкі, якія індывідуальна падбіраюцца для кожнага. Тэсты, якія выкарыстоўваюцца СПЦ, умоўна можна разбіць на некалькі катэгорый: тэсты, якія дыягнастуюць інтэлект, прафесійная арыентацыя, тэсты на дыягностыку псіхічных станаў і ўласцівасцяў асобы.

Кансультаванне мае на ўвазе дапамогу псіхолага студэнту ў вырашэнні асабовых і міжасабовых праблем. Неабходна адзначыць, што кансультаванне — гэта сумесная работа псіхолага і студэнта. Псіхолаг не прапануе студэнту гатовых адказаў, рэцэптаў, указанняў, як вырашыць праблему. Задача псіхолага — дапамагчы маладому чалавеку самому разабрацца ў праблеме, знайсці магчымыя шляхі яе вырашэння.

У рамках развіваючай дзейнасці ў сацыяльна-псіхалагічным цэнтры праводзяцца трэнінгавыя заняткі, мэта якіх — дапамагчы студэнтам адаптавацца ў новых сацыяльных умовах, развіць камунікатыўныя навыкі.

Акрамя таго, сацыяльна-псіхалагічны цэнтр выконвае сацыяльныя заказы. Сутнасць сацыяльных заказаў у тым, што група студэнтаў можа заказаць лекцыю альбо цыкл лекцый па псіхалогіі на тэму, якая іх цікавіць.

Спадзяемся, што такія сустрэчы псіхолагаў з першакурснікамі стануць яшчэ адной добрай традыцыяй СПЦ.

*Вольга КУЛІКОВА*

АКЦЫІ

# ПА СЛЯДАХ НАСТУПАЮЧАЙ ПАНДЭМІІ

1 снежня ў Белдзяржуніверсітэце да Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу была наладжана выстава "Па слядах наступаючай пандэміі", якую арганізавалі Фундаментальная бібліятэка БДУ і Студэнцкі саюз БДУ. На выставе была прадстаўлена літаратура, якая расказвала пра гэтую страшную хваробу. Была арганізавана віктарына сярод наведвальнікаў выставы, прызы для якой былі прадстаўлены Рэспубліканскім цэнтрам прафілактыкі СНІДу Рэспублікі Беларусь. Гэта аказалася вельмі карысным, таму што, як высветлілася, моладзь ведае пра СНІД не так шмат.

*Аляксей БАГАМАЗАЎ*

У КАМЕННЫМ ЦАРСТВЕ

# Шаманскі камень

Прыадчынім дзверы ў музей землязнаўства, які мы параўноўвалі з чароўнай скарбонкай, і пазнаёмімся на гэты раз з тапазам, адным з яскравейшых прадстаўнікоў мінеральнага свету, які мае цікавую гісторыю. А было гэта так. У далёкай Эфіопіі на беразе мора жыло племя, якое грэкі называлі трагладытамі, па-грэчаску азначае "жывуць у норах, пячорах". Уладарылі яны востравам, які трагладыты называлі тапазон — "туманны". Знаходзілі яны на гэтым востраве прыгожыя залацістыя камяні. У той час знакаміты Пліній без сумнення называў іх "хрызалітамі". Ніхто не пярэчыў аўтарытэтнаму навукоўцу, але на гэты раз ён памыліўся. З цягам часу вызначылі, што плініўскія хрызаліты з'яўляюцца тапазамі (імя далі па востраву), а другі мінерал, празрысты, залаціста-зялёны алівін, застаўся на вякі хрызалітам. На гэтым гісторыя з назвай не завяршылася. Амаль праз тысячу гадоў зноў з'явілася камень (на гэты раз дымчаты кварц) з назвай "раўхтапаз". Разумныя людзі навучыліся цёмныя кварцы "запякаць" у хлебе, пасля печы яны станавіліся залаціста-карычневымі. Прывабныя кварцы сталі папулярнымі ў ювеліраў і яшчэ ў 19 стагоддзі іх пачалі называць проста "тапаз" без прыстаўкі "раух", што азначае дым. Гэта памылка бытуе і па сённяшні дзень. У ювелірных магазінах, на мінералагічных выставах вам могуць прапанаваць "тапаз", што хутчэй будзе дымчатым кварцам. Блыталі яго і з алмазам. Вядомы дыямент Браганда, які многа гадоў упрыгожваў партугальскую карону, на самой справе з'яўляецца тапазам. Гэты цудоўны камень знешне ў прыродзе так падобны на простае шкло, і чалавек, які не знаёмы з мінераламі, не зверне на яго ніякай увагі. Як жа іх адрозніць? Па фізічных уласцівасцях тапаз мае высокія цвёрдасць, спайнасць, шчыльнасць, высокі паказчык дысперсіі і праламляльнасці святла. Каляровая гама гэтага празрыстага самацвета разнастайная — ён бывае блакітным, сінім, сіне-зялёным, вінна-жоўтым, аранжавым, ружовым. Сустракаюцца бясколерныя, зрэдку пападаюцца і шматкаляровыя. Афарбоўка забяспечваецца галоўным чынам дамешкам тытану. Пры награванні і пад прамым уздзеяннем сонечных промняў камень асвятляецца. Самымі каштоўнымі на сусветным рынку лічацца фіялетавыя, затым ружовыя, потым вінна-жоўтыя, густога чайнага колеру і блакітныя.



Ордэн «Залатое руна» з тапазамі

Самым вялікім з вядомых тапазаў раней лічыўся крышталь вагою 270,3 кілаграмы, ён быў знойдзены ў Бразіліі, а зараз знаходзіцца ў Нью-Йоркскім музеі натуральнай гісторыі. Таксама ў Бразіліі ў 1986 годзе адшукалі бясколерны крышталь вагой больш за 5 тон і памерам 2×1,8 метра, які з'яўляецца рэкардсменам сярод тапазаў. У Венскім музеі экспануецца яшчэ адзін цудоўны бразільскі крышталь у 117 кілаграмаў. Вагой больш за 64 кілаграмы знойдзены тапаз у Нарвегіі. У Расіі вядомы ўральскія і забайкальскія радовішчы. Зараз лепшымі ў свеце ювелірнымі камянямі лічацца валынскія, што на Украіне. Там жа быў знойдзены вельмі прыгожы, чысты і празрысты крышталь вагой 110 кілаграмаў, з якога выраблена вялікая колькасць каштоўных упрыгожванняў. З асаблівай павагай і шанаваннем захоўваюцца экспанаты ў Дрэздэне ў музеі "Зялёны звод", сярод якіх нагрудны знак ордэна Залатога Руна. Яго лічылі раней, лічаць і зараз самай прэстыжнай рыцарскай годнасцю ў каталіцкай Еўропе. Асноўным упрыгожваннем знака з'яўляюцца непаўторныя ліловыя тапазы, колькасць уладальнікаў якіх на сённяшні дзень перавышае лічбу 60. Знак гэтага ордэна захоўваецца ў Алмазным фондзе Расіі (гл. здымак).



Крышталі тапаза



Тапаз з кварцам, альбітам

Здабываюцца тапазы яшчэ ў ЗША, на Мадагаскары, меншая колькасць у Шры-Ланцы, Японіі і Аўстраліі.

У старажытнай сімволіцы тапаз азначаў разважнасць і добрыя справы, гэта сімвал мужнасці, вернасці, высакароднасці. Людзі, якія носяць тапаз, становяцца сумленнымі, прыстойнымі, велікадушнымі. Камень з'яўляецца добрым амулетам ад сурокаў, ім верылі заўжды. Дык што ж тут дрэннага, хай і зараз таямнічы і прыгожы самацвет дапаможа не ўпусціць сваё шчасце.

У музеі землязнаўства каля двух дзесяткаў тапазаў. Шчыра запрашаем студэнтаў, супрацоўнікаў, гасцей універсітэта наведаць геаграфічны факультэт, дзе знаходзіцца таямнічы свет камянёў.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# ЯШЧЭ АДЗІН МАЙСТРА...

Нядаўна зборная каманда Беларусі па гіраваму спорту вярнулася з першынства і чэмпіяната свету, што адначасова праходзілі ў расійскім гарадку Урупінск.

На жаль, з-за недахопу сродкаў на спаборніцтвы паехалі толькі тыя спартсмены, хто мог разлічваць на медалі. Таму нашы зборныя выступалі ў няпоўных складах (чатыры чалавекі на першынстве і шасцёра на чэмпіянаце свету) і занялі агульныя чацвёртыя месцы ў абодвух спаборніцтвах.

У складзе зборнай былі і два студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта: першакурснік фізічнага факультэта Алег Сагадзін і трэцякурснік юрыдычнага факультэта Алесь Воўк.

У вагавай катэгорыі да 75 кілаграмаў на першынстве свету сярод юнакоў да 20 гадоў Алег быў другім. А вось на чэмпіянаце сярод дарослых — даволі далёка ад прызёраў.

Пэўныя надзеі трэнеры ўскладалі на выступленне мінулагодняга пераможцы першынства свету ў вазе да 80 кілаграмаў Алеся Ваўка. Але ён на гэты раз — толькі другі. На жаль, у апошнія некалькі год у Алеся не ідуць вынікі: колькі падымаў ён два гады назад, столькі падымае і зараз. А ў "міравых гірах" такія вынікі не дазваляюць перамагаць. Трэба ўвесь час прыбаўляць і прыбаўляць, каб ісці ў нагу з сапернікамі.

На чэмпіянаце ж свету Алесь зазначыўся на чацвёртым месцы, што дало яму магчымасць выканаць нарматыў майстра спорту міжнароднага класа.

*Вольга КУЛІКОВА*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана да друку ў 12.00

9 снежня
Зак. 833.
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.

Рэдактар Т. М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Вольгі Сырыч